# Беларуская мова

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

### I КЛАС

**Кантрольнае спісванне**

**Лес**

Хутка лета. Цябе чакае ў госці лес. Ён частуе ягадамі і грыбамі. Будзь толькі добры з лесам! (18 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі*

**Памочніца**

Маленькая Галя любіць дапамагаць бацькам. Сёння ёй даручылі памыць яблыкі. Разам з мамай яна будзе варыць кампот. (18 слоў)

*Паводле К. Каліны*

**Лепшы падарунак**

Маё жаданне спраўдзілася. Бацькі падарылі мне шчаня! Я выгульваю Рэкса. Не забываю пакарміць яго. Мы заўсёды разам. (19 слоў)

### II КЛАС

**Дыктанты**

**Брусніцы**

Першыя брусніцы з'яўляюцца ў канцы жніўня. Але ісці па іх лепш у верасні. У гэтым месяцы ўсе брусніцы ўжо спелыя. Свежыя ягады можна трымаць у холадзе або вадзе. Тады яны цэлую зіму не губляюць вітамінаў. (36 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

**Чарніцы**

Чарніц заўсёды шмат у нашых лясах. Гэтыя ягады цёмна-сіняга колеру з шызым налётам. Яны растуць на нізкіх кусціках з дробным лісцем. Чарніцы цудоўныя на смак і карысныя для здароўя. З гэтых ягад людзі вараць смачнае варэнне. (37 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

Запісаць на дошцы слова *цёмна-сіняга*.

**У грыбы**

Надзейка з мамай прыйшлі ў лес збіраць грыбы. Добра летняй раніцай у лесе! Ласкава грэе сонейка. Усюды спяваюць птушкі. Зумкаюць у траве конікі.

За ноч пасля дажджу вырасла шмат баравікоў. Надзейка хутка назбірала поўны кошык грыбоў. (38 слоў)

*Паводле В. Гурскага*

Запісаць на дошцы слова *прыйшлі*.

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

### II КЛАС

**Дыктанты**

**Вясновы дзень**

Які цудоўны вясновы дзень! Неба прыгожага блакітнага колеру. Ярка свеціць сонейка. Звонка спяваюць птушкі. Вылецелі з вулея працавітыя пчолкі. Яны шукаюць першыя кветкі. (25 слоў)

**На канікулах**

Хутка лета. Я паеду ў вёску да бабулі і дзядулі. Разам мы будзем хадзіць у лес. Летам там можна назбіраць ягад і грыбоў. (25 слоў)

**Свая градка**

Вясной Жэня пасадзіў градку гароху. Летам вусаты гарох прыгожа зацвіў. Над яго кветкамі лёталі матылькі. Весела гулі працавітыя пчолкі. Маленькі Жэня з цікавасцю назіраў за імі. (28 слоў)

*Паводле Я. Бяганскай*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАМІ НАВУЧАННЯ

### III КЛАС

**Дыктанты з граматычным заданнем**

**Смачная бульба**

Рыгорка дапамагаў бацькам капаць бульбу. З татам яны ссыпалі бульбу ў мяхі. Потым перавозілі яе ў склеп. Разам хутка справіліся з работай!

Вечарам мама наварыла бульбы. Уся сям'я сабралася за сталом. Рыгорка паспрабаваў бульбіну і цмокнуў губамі. Такой смачнай бульбы ён яшчэ не еў! (46 слоў)

*Паводле А. Зянько*

Запісаць на дошцы слова *ссыпалі*.

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту слова, блізкае па значэнні да прапанаванага.
   - Праца *(I варыянт)*.
   - Бацька *(II варыянт)*.
2. Выпішыце з тэксту аднакаранёвае слова да прапанаванага. Абазначце корань.
   - Вячэрні *(I варыянт)*.
   - Сталовы *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   - Уся сям'я сабралася за сталом *(I варыянт)*.
   - Вечарам мама наварыла бульбы *(II варыянт)*.

**Ажыны**

Кусцікі ажын растуць па берагах лясных рэк і ручаёў. Прайсці праз іх зараснікі не так проста. Галінкі маюць вострыя калючкі.

Ягады паспяваюць у жніўні. Знешне яны падобныя да малін. Толькі не чырвоныя, а чорныя.

Свежыя ажыны выдатна праганяюць смагу. Ажынавае варэнне вельмі духмянае і смачнае. (46 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

Паведаміць пра пастаноўку коскі.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце слова па саставе.
   - Лясных *(I варыянт)*.
   - Ажынавае *(II варыянт)*.
2. Вызначце лік і род назоўнікаў у сказе.
   - Галінкі маюць вострыя калючкі *(I варыянт)*.
   - Ягады паспяваюць у жніўні *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   - Кусцікі ажын растуць па берагах лясных рэк і ручаёў *(I варыянт)*.
   - Свежыя ажыны выдатна праганяюць смагу *(II варыянт)*.

**Суніцы**

З ягаднай сям'і суніцы паспяваюць першыя. Яны з'яўляюцца ў канцы чэрвеня. Сустрэць сунічнік можна на светлых палянах, каля лясных сцежак.

Якія цудоўныя суніцы на смак! Людзі сушаць гэтыя ягады. З іх цiснуць сок і вараць варэнне. Але самыя смачныя і карысныя свежыя суніцы. Не лянуйцеся збіраць іх! (48 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

Паведаміць пра пастаноўку коскі.

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, супрацьлеглыя па значэнні да прапанаваных.
   - Цёмныя, нельга *(I варыянт)*.
   - Пачатак, апошнія *(II варыянт)*.
2. Разбярыце слова па саставе.
   - Ягаднай *(I варыянт)*.
   - Лясных *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   - Людзі сушаць гэтыя ягады *(I варыянт)*.
   - З ягаднай сям'і суніцы паспяваюць першыя *(II варыянт)*.

## IV КЛАС

### Дыктанты з граматычным заданнем

**Незвычайная цукерка**

Маленькага Максімку пачаставалі незвычайнай цукеркай. Гэта быў шакаладны бегемоцік. Хлопчык пакруціў гасцінец у руках і ўздыхнуў. Шкада бегемоціка! Не адважыўся Максімка з'есці пачастунак.

Хлопчык падарыў незвычайную цукерку сяброўцы Марыне. Яна таксама не з'ела шакаладнага бегемоціка. Ён быў вельмі прыгожы! Дзяўчынка прынесла цукерку ў свой двор. Яна аддала бегемоціка Міколку.

Так дзеці перадавалі адзін аднаму цукерку. Хутка некрануты шакаладны бегемоцік зноў апынуўся ў Максімкі. (65 слоў)

*Паводле І. Шахрая*

Запісаць на дошцы слова *бегемоцік*.

***Граматычнае заданне***

1. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і род.
   - Яна таксама не з'ела шакаладнага бегемоціка *(I варыянт)*.
   - Хлопчык падарыў незвычайную цукерку сяброўцы Марыне *(II варыянт)*.
2. Разбярыце слова па саставе.
   - Шакаладнага *(I варыянт)*.
   - Маленькага *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   - Хлопчык падарыў незвычайную цукерку сяброўцы Марыне *(I варыянт)*.
   - Дзяўчынка прынесла цукерку ў свой двор *(II варыянт)*.

**Сланечнікі**

Сяргейка і Уладзік вясной пасадзілі сланечнікі. Яны раслі вельмі хутка. Аднойчы сланечнікі зацвілі. Кветкі ў іх былі прыгожага жоўтага колеру.

Непрыкметна мінула цёплае лета. На агародзе ўсё пачало даспяваць. Даспелі і сланечнікі. На градку сталі прылятаць вераб'і. Яны садзіліся на сланечнікі і выдзёўбвалі буйныя зярняты.

Хлопчыкі не крыўдзіліся на птушак. На кожным сланечніку было шмат зярнятак. Іх для ўсіх хапіла!

Самы вялікі сланечнік хлопчыкі занеслі на школьную выставу. (69 слоў)

*Паводле Я. Бяганскай*

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.
   - Халоднае, адцвілі *(I варыянт)*.
   - Мала, зіма *(II варыянт)*.

2. Вызначце лік, род і склон назоўнікаў у сказе.
   - На градку сталі прылятаць вераб'і *(I варыянт)*.
   - Хлопчыкі не крыўдзіліся на птушак *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.
   - Яны садзіліся на сланечнікі і выдзёўбвалі буйныя зярняты *(I варыянт)*.
   - Сяргейка і Уладзік вясной пасадзілі сланечнікі *(II варыянт)*.

**Памочнік**

Жэня не можа сядзець без працы. Ён дапамагае маме і бабулі на кухні. З братам часта майструе што-небудзь. Можна ўбачыць хлопчыка з бацькам у агародзе. Любіць дапамагаць Жэня дарослым!

Вясной бабуля і мама рабілі градкі. Жэня захацеў зрабіць свой радок. Мама купіла для яго дзіцячую рыдлёўку і палівачку. Дзед выстругаў маленькія граблі. Брат дапамог ускапаць градку. Разам хлопчыкі пасадзілі там гарох, моркву, рэпу. (68 слоў)

*Паводле Я. Бяганскай*

Запісаць на дошцы слова *што-небудзь*.

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвае слова да прапанаванага. Абазначце корань.
   - Гарохавы *(I варыянт)*.
   - Бацькоўскі *(II варыянт)*.
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і асобу.
   - Ён дапамагае маме і бабулі на кухні *(I варыянт)*.
   - З братам часта майструе што-небудзь *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   - Мама купіла рыдлёўку і палівачку *(I варыянт)*.
   - Дзед выстругаў маленькія граблі *(II варыянт)*.

*ЛІТАРАТУРА*

Гурскі, В. Р. Кучараўчык : апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Р. Гурскі. — Мінск : Маст. літ., 2004. — 159 с.

Чытанка для ласуноў : для дзяцей мал. шк. узросту / уклад. І. А. Буторына. — Мінск : Звязда, 2016. — 168 с.

Ягоўдзік, У. Год-карагод : апавяданні і мініяцюры для мал. і сярэд. шк. узросту / У. Ягоўдзік. — Мінск : Выд. М. Ягоўдзік, 2013. — 160 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт



*На дыску — тэксты для спісвання.*

**Кампетэнтнасны падыход**




**Беларуская мова**
**Навучанне грамаце**
Н. М. Антановіч

**Літаратурнае чытанне**
Н. М. Антановіч,
Г. М. Федаровіч




**Мова — наша спадчына**
**Дадатковыя практыкаванні**
Н. М. Антановіч
**3 клас. I паўгоддзе**
**3 клас. II паўгоддзе**




**Дыктанты і спісванні па беларускай мове**
**2—4 класы**
Н. М. Антановіч,
Н. У. Антонава




**Правілы беларускай мовы ў алгарытмах і схемах**
**2—4 класы**
Н. М. Антановіч